Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
26 САКАВІКА 2015 г. ЧАЦВЕР № 57 (27915) Кошт 1800 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Дзе ў Мінску жыллё самае таннае?**

СТАР. 3

ЧЫРВОНКА. ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



**Соль і хлеб шахцёрскай працы**



**Лянота — толькі для суботы**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля ГУЙВІК, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па заканадаўстве:**

*«Згодна з новай рэдакцыяй Дырэктывы №2 аб мерах па дэбюракратызацыі дзяржапарату, гэты працэс распаўсюджваецца не толькі на дзяржорганы, але і на ўсе структуры, з якімі часта сутыкаюцца грамадзяне, вырашаючы тыя ці іншыя праблемныя пытанні. Магчымасць такога звароту з'яўляецца канстытуцыйным правам грамадзяніна, але, на жаль, практыка паказвае, што не заўсёды прымаюцца дзейсныя меры па вырашэнні праблем, не заўсёды забяспечваецца ўважлівае стаўленне да просьбаў грамадзян. У сувязі з гэтым узнікла неабходнасць распаўсюдзіць гэты працэс і на іншыя арганізацыі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.03.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14560,00 | ▼ |
| Еўра | 15910,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 252,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 622,22 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ДРЭВЫ ЖЫЦЦЯ

**Гэта сімвалічна і кранальна — у Трасцянцы, на месцы аднаго з самых жахлівых гітлераўскіх лагераў смерці, дзе было закатавана больш за 200 тысяч чалавек, у год 70-годдзя пазбаўлення свету ад фашысцкай навалы з'явіўся яблыневы сад. 70 маладых яблынек пасадзілі актывісты БРСМ з усіх абласцей краіны, гэтым падтрымаўшы новы патрыятычны праект «Кветкі Вялікай Перамогі», знак якога — кветка яблыні ў чырвона-зялёнай стужцы. Маладыя саджанцы, прывезеныя са Стаўбцоўскага і Пухавіцкага раёнаў, яшчэ тонкія і кволыя, каб даць кветкі. Але яны абавязкова вырастуць у моцныя дрэвы і бела-ружовай кіпенню будуць вітаць чарговую гадавіну Перамогі, якую будуць помніць і святкаваць дзеці і ўнукі тых, хто гэты сад пасадзіў. На гэтай шматпакутнай зямлі менавіта так і павінна быць, і будзе.**






Настасся ЧАЙКОЎСКАЯ садзіла дрэўцы ад Магілёўшчыны — яна працуе на заводзе «Магілёўліфтмаш».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Пасяўная

## Што пасеем, тое і пажнём

**Ранняя вясна дала магчымасць усім абласцям пачаць падрыхтоўку да пасяўной і нават саму пасяўную. Згодна з інфармацыяй прэс-службы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Брэсцкая і Гомельская вобласці падрыхтавалі 100% глебы для ранніх яравых збожжавых і зернебабовых культур.**



Механізатар прадпрыемства «Слаўмол» Аляксандр ЛЕБЕДЗЕЎ.

Гродзенская і Мінская вобласці пакуль што адстаюць — толькі 29,8% і 18,4% адпаведна. Зразумела, што паўночная вобласць — Віцебская — хоць і ўключылася ў справу, знаходзіцца яшчэ ў самым пачатку — 1,3%. Агулам па краіне падрыхтавана 36,5% пасяўных плошчаў.

Акрамя гэтага, ужо засеяна ранніміі яравымі збожжавымі і зернебабовымі культурамі 155,4 тысячы гектараў. Гэта 16,2% ад плана. У лідарах зноў Брэсцкая (46,4%) і Гомельская (56,9%) вобласці.

Пачатак неблагі. Галоўнае, каб надвор'е не сапсавалася.

СТАР. 3

■ На слыху

## ПАКАЗАННІ ДА ПРЫМЯНЕННЯ

Эфектыўнасць лекаў залежыць ад іх складу, а не ад вытворцы

**Забеспячэнне насельніцтва даступнымі і якаснымі айчыннымі лекамі з'яўляецца пытаннем нацыянальнай бяспекі. Міністэрства аховы здароўя імкнецца да таго, каб доля беларускіх прэпаратаў на ўнутраным рынку склала ў коштавым выражэнні да канца гэтага года не менш за палову. Арыгінальныя беларускія лекі высока ацэнены сусветнымі экспертамі, як, дарэчы, і генерыкі, якія па ўсіх параметрах ідэнтычныя замежным аналагам, але значна таннейшыя. Аднак многія пацыенты і ўрачы ставяцца да беларускіх лекаў з меншым даверам, чым да імпартных. Аб якасці айчынных прэпаратаў падчас анлайн-канферэнцыі БЕЛТА расказалі вядучыя спецыялісты ў гэтай галіне.**

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2015 года!**

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

# ПАДТРЫМКА — ТОЛЬКІ ПЕРСПЕКТЫЎНЫМ

## Дзяржава будзе інвеставаць у прадпрыемствы заўтрашняга дня

**Першарадная ўвага будзе надавацца таксама прадпрыемствам, што працуюць на мясцовай сыравіне. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, наведваючы ААТ «Пеленг», паведамляе БЕЛТА.**

Прэзідэнт азнаёміўся са станам і перспектыўнымі напрамкамі работы арганізацый абароннага сектара беларускай эканомікі па вытворчасці найноўшых узораў узбраенняў і абсталявання. Кіраўнік дзяржавы цікавіўся эканамічнымі паказчыкамі работы кампаніі «Пеленг» і ўвогуле прадпрыемстваў Дзяржкамваенпрама, існуючымі праблемнымі пытаннямі ў галіне.

Аляксандру Лукашэнку далажылі таксама пра выкананне яго даручэнняў па рэалізацыі праектаў стварэння айчыннай касмічнай тэхнікі. Прэзідэнт азнаёміўся з узорамі касмічнага абсталявання, што выпускаецца, аснашчэннем вытворчай базы і тэхналагічнымі працэсамі зборкі касмічнай тэхнікі, вырабу буйнагабарытнай аптычнай тэхнікі. Кіраўніку дзяржавы былі прадстаўлены новыя і перспектыўныя ўзоры ўзбраенняў, што вырабляюцца прадпрыемствамі абароннага сектара, оптыка-электронная апаратура, якая выпускаецца прадпрыемствам «Пеленг». Прэзідэнту далажылі таксама аб перспектывах развіцця кампаніі і касмічнага прыборабудавання.

Кіраўнік дзяржавы застаўся задаволены работай прадпрыемства. «Мне кампанія спадабалася: вы працуеце, ні ў кога грошай не просіце», — сказаў ён.

У час размовы з працоўным калектывам ААТ «Пеленг» Аляксандр Лукашэнка расказаў пра прычыны наведвання. Паводле яго слоў, ён прыехаў паглядзець, як працуюць найлепшыя прадпрыемствы, каб, убачыўшы горшыя, мог параўнаць.

«Было пастаўлена шмат задач. Мы ж экзамен здаём перад вамі, і вы са мной будзеце здаваць экзамен перад беларускім народам: што мы зрабілі перадавога? Народ павінен бачыць — у нашай краіны ёсць будучыня. Вы адну з задач выканалі, маеце перспектывы, свае грошы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што на працягу года трэба вызначыцца, што засталося дарабіць, «асабліва ў гэтыя складаныя часы, галоўнае — не спыніцца, трэба ісці наперад».

Прэзідэнт таксама паведаміў, што ў маі з трохдзённым візітам у Беларусі чакаюць старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі. «Пеленг» актыўна супрацоўнічае з партнёрамі з Кітая. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, знаходзячыся ў Кітаі, наведваў такія прадпрыемствы. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што плануе паказаць старшыні КНР у тым ліку пункты супрацоўніцтва з Кітаем.

«Гэтая краіна, якая сёння шукае партнёраў, мае шмат грошай. Калі мы будзем, як цяпер, з імі ў партнёрах і станем развіваць супрацоўніцтва па ўсіх напрамках, мы можам атрымаць і крэдыты, і заказы. Для нас галоўнае — заказы», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Мы да гэтага візіту вельмі сур'ёзна рыхтуемся», — дадаў Прэзідэнт.

# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — ВЕТЭРАНЫ

**Пра гэта было заяўлена ўчора падчас асабістага прыёму грамадзян, які правяла міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ у Шчучыне.**

Міністр адзначыла, што дзякуючы палітыцы Прэзідэнта дзяржава ўсе гэтыя гады ўважліва ставілася і ставіцца да праблем ветэранаў, захавання памяці аб Вялікай Айчыннай вайне і Перамозе. І далей у краіне будуць памятаць, якім быў кошт атрыманага міру, як сваёй пасляваеннай працай ветэраны стварылі дабробыты, што сталі асновай для незалежнасці краіны сёння. На міжнародных сустрэчах самага высокага ўзроўню кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэслівае, што цяпер у нас ёсць і наша задача — не аддаць Перамогу нікому, не дазволіць яе перакройваць.

Учора ж Лілія Ананіч прыняла ўдзел у дні інфармавання ў Слоніме, дзе разглядаліся пытанні рэалізацыі маладзёжнай палітыкі. Размова ішла пра тое, што адзін з найважнейшых напрамкаў — выхаванне новага пакалення ў духу патрыятызму, захавання традыцый, багатай спадчыны, атрыманай дзякуючы ветэранам. Моладзь з вялікай павагай ставіцца да ветэранаў, як падкрэсліла міністр.

Што тычыцца Шчучына, то ў верасні тут адбудзецца рэспубліканскае свята — Дзень беларускага пісьменства, цэнтральнай тэмай якога таксама стане 70-годдзе Перамогі. Ветэраны будуць аднымі з самых ганаровых гасцей на ім.

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**

■ Выбары-2015

# Палітычныя партыі пакуль неактыўныя

## Лідзія Ярмошына расказала пра падрыхтоўку да выбарчай кампаніі

**Выбары Прэзідэнта краіны павінны адбыцца ўжо ў лістападзе гэтага года, але пакуль не назіраецца асаблівай актыўнасці з боку палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Пра гэта паведаміла журналістам Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, напярэдадні навукова-практычнага семінара «Беларусь на сучасным этапе развіцця: сацыяльна-палітычны і эканамічны аналіз» для актыву РГА «Белая Русь».**



Фота БЕЛТА

Лідзія Ярмошына нагадала, што ў адпаведнасці з узгодненай вусна датай выбары адбудуцца ў апошнюю магчымую па заканадаўчых нормах нядзелю лістапада, якая выпадае на 15-е чысло названага месяца.

— Адпаведна, старт выбарчай кампаніі павінны быць аб'яўлены не пазней за 15 чэрвеня гэтага года, паколькі неабходны тэхнічны тэрмін на падрыхтоўку і правядзенне выбараў у нас па заканадаўстве — тры месяцы, — патлумачыла старшыня ЦВК. — З улікам таго, што 15 чэрвеня — гэта субота, выбарчая кампанія, хутчэй за ўсё, пачнецца ў сярэдзіне тыдня. У якасці найбольш верагоднай даты мы называем 12 чэрвеня.

Гаворачы пра тое, ці назірае зараз Цэнтральная выбарчая камісія пэўнае ажыўленне ў дзейнасці палітычных партый, рухаў, грамадскіх арганізацый, Лідзія Ярмошына заўважыла, што найбольшую актыўнасць праяўляюць дзве арганізацыі — «Белая Русь» і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, якія падтрымліваюць афіцыйную палітыку дзяржавы.

— Прадстаўнікі ад гэтых арганізацый ужо прыходзяць да юрыстаў Цэнтральнай выбарчай камісіі і кансультуюцца. Гэта сведчыць аб тым, што яны збіраюцца ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі прафесійна і не парушаць закон. Хацелася б, каб астатнія неяк падцягнуліся да ўзроўню гэтых грамадскіх аб'яднанняў, часу ўжо засталося няшмат. У нас каля 1000 грамадскіх аб'яднанняў акрамя 30 палітычных партый, і такое маўчанне — недальнабачнае, — лічыць Лідзія Ярмошына.

Акцэнтуючы ўвагу на асаблівасцях будучай выбарчай кампаніі, старшыня ЦВК паведаміла, што прэзідэнцкія выбары будуць праводзіцца ў рамках тых традыцый, якія ўжо склаліся. Аднак з некаторымі новаўвядзеннямі.

— Па-першае, у кандыдатаў у прэзідэнты павялічыўся асабісты фонд. Яны атрымаюць магчымасць яго сфарміраваць ужо з моманту рэгістрацыі ініцыятыўнай групы — гэта значыць, яшчэ да свайго кандыдацтва — і ўжо змогуць фінансаваць яе працу, што палегчыць гэты працэс і, натуральна, збор подпісаў. Па-другое, дзяржава паклапоціцца, каб у кожнага выбаршчыка была ў паштовай скрынцы інфармацыя пра кожнага кандыдата ў прэзідэнты.

Лідзія Ярмошына паведаміла, што ЦВК вырашае пытанне, як паклапаціцца пра людзей, якія не могуць самастойна прагаласаваць.

— У прыватнасці, разам з Таварыствам сляпых мы прапрацоўваем праект па арганізацыі галасавання грамадзян, якія не бачаць або бачаць дрэнна, — заўважыла старшыня ЦВК. — Магу сказаць, што разам з бюлетэнямі ў нас будуць заказаны спецыяльныя трафарэты. У іх будуць устаўляцца бюлетэні для грамадзян, якія не бачаць, і яны змогуць такім чынам самастойна прагаласаваць. Будуць выраблены спецыяльныя агітацыйныя дакументы па сістэме Брайля, каб сляпыя маглі азнаёміцца з інфармацыяй пра кандыдатаў у прэзідэнты. Трэба сказаць таксама, што сайт Цэнтральнай выбарчай камісіі будзе адаптаваны для людзей, якія слаба бачаць. Такім чынам, Беларусь увайшла ў агульнасусветную тэндэнцыю па аказанні садзейнічання грамадзянам з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

Лідзія Ярмошына паведаміла, што чакае ўдзелу ў маніторынгу выбараў Прэзідэнта місій СНД, АБСЕ і Савета Еўропы. Старшыня ЦВК звярнула ўвагу, што Беларусь традыцыйна запрашае міжнародных назіральнікаў, аднак гэтае пытанне не ўваходзіць у кампетэнцыю Цэнтральнай выбарчай камісіі. Як правіла, рашэнне прымае кіраўнік дзяржавы разам з зацікаўленымі органамі падчас прызначэння даты выбараў.

— Але ўжо зараз атрымана прынцыповая згода на запрашэнне традыцыйных місій — АБСЕ і СНД, — праінфармавала Лідзія Ярмошына. — Акрамя таго, да нас імкнецца Савет Еўропы, членамі якога мы не з'яўляемся на дадзены момант. Тым не менш, да нас прыязджаў спецдакладчык па Беларусі спадар Рыгоні, і ён усё задаваў пытанне аб магчымасці запрашэння.

У сваю чаргу **Уладзімір СЯНЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**, які таксама прыняў удзел у семінары, расказаў, як сітуацыя за мяжой паўплывае на выбарчую кампанію ў Беларусі.

— Думаю, што знешнія ўмовы будуць аказваць пэўны ўплыў на сітуацыю ў краіне, — канстатаваў ён. — Стан нашай эканомікі часткова ўскладняецца менавіта ўздзеяннем знешніх фактараў. Але сур'ёзнага ўплыву на правядзенне прэзідэнцкіх выбараў гэта не акажа, бо сітуацыя ў эканоміцы ўсё ж не крытычная.

Таксама парламентарый паведаміў, што ў сувязі з міратворчымі ініцыятывамі па ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне палітычны рэйтынг Беларусі ў апошні час значна вырас.

**Надзея ЮШКЕВІЧ** ■

# НА СУВЯЗІ — УЛАДА

**Як вядома, у нашай краіне сёлета арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній з мэтай павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**



Такія прамыя тэлефонныя лініі стартавалі 17 студзеня і праводзяцца кожную суботу.

Найбліжэйшая з іх адбудзецца ў гэтую суботу, 28 сакавіка. Пройдзе яна з 9.00 да 12.00.

Тэлефонныя лініі ў суботу правядуць:

намеснік старшыні **Брэсцкага аблвыканкама** Сакоўскі Віктар Яўгенавіч (8 016 221 31 21);

старшыня **Віцебскага абласнога** Савета дэпутатаў Ацясаў Аляксандр Ягоравіч (8 021 220 42 60);

намеснік старшыні **Гомельскага аблвыканкама** Прывалаў Уладзімір Аляксандравіч (8 023 275 12 37);

намеснік старшыні **Гродзенскага аблвыканкама** Дзяшко Уладзімір Іосіфавіч (8 015 273 56 44);

намеснік старшыні **Мінскага аблвыканкама** Сірэнка Віктар Іванавіч (8 017 500 41 60);

кіраўнік спраў **Магілёўскага аблвыканкама** Варонін Рыгор Аляксандравіч (8 022 250 18 69);

намеснік старшыні **Мінскага гарвыканкама** Дамарацкі Андрэй Уладзіміравіч (8 017 222 44 44).

**ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ**

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО**

**«МИНСККОНТРАКТ»**

**220088, г. Минск, ул. Смоленская, 25, УНП 100251588**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2015 г.** (млн руб.)

| АКТИВЫ | |
|---|---|
| Долгосрочные активы | 52549 |
| в том числе: | |
| Основные средства | 51548 |
| Нематериальные активы | 27 |
| Вложения в долгосрочные активы | 10 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 964 |
| Краткосрочные активы | 73169 |
| в том числе: | |
| Запасы | 22636 |
| Расходы будущих периодов | 36 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 1051 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 43867 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 4443 |
| Прочие краткосрочные активы | 1136 |
| **БАЛАНС** | **125718** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | |
|---|---|
| Собственный капитал | 70180 |
| в том числе: | |
| Уставный капитал | 44049 |
| Собственные акции | (163) |
| Резервный капитал | 255 |
| Добавочный капитал | 15500 |
| Нераспределенная прибыль | 10539 |
| Краткосрочные обязательства | 55538 |
| в том числе: | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 23797 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 31741 |
| **БАЛАНС** | **125718** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2014 г.**

| Наименование показателей | млн руб. |
|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 223123 |
| Себестоимость реализованных продукции, товаров, работ, услуг | 183791 |
| **Валовая прибыль** | **39332** |
| Расходы на реализацию | 25611 |
| **Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг** | **13721** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 46382 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 51152 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | **8951** |
| *Доходы по инвестиционной деятельности* | *2049* |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 38 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 7 |
| проценты к получению | 2004 |

| Наименование показателей | млн руб. |
|---|---|
| *Расходы по инвестиционной деятельности* | *36* |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 36 |
| *Доходы по финансовой деятельности* | *7165* |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 7165 |
| *Расходы по финансовой деятельности* | *8553* |
| в том числе: проценты к уплате | 2177 |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 6376 |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности** | **625** |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения** | **9576** |
| Налог на прибыль | 2629 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 0 |
| **Чистая прибыль (убыток)** | **6947** |

1. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %) – 54,22.
2. Количество акционеров – всего 790.
В том числе: юридических лиц – 2, физических лиц – 788.

3. Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателей | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 966 | 238 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 709 | 189 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 3 850 | 950 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | рублей | 3 850 | 950 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 278,8 | 256,8 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | 930 | 930 |

4. Среднесписочная численность работающих (человек) – 129.
5. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: **оптовая торговля.**
6. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: **25 марта 2015 г.**
7. Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг, утвержденный протоколом №23 на общем собрании акционеров от 26.03.2010 г.

Генеральный директор В.Л. Плавский

Главный бухгалтер И.С. Шавель

■ Нерухомасць

# ВУЛІЦЫ ЖЫЛЛЁВЫХ СТОКАЎ

## 30 вуліц Мінска з самымі нізкімі цэнамі на жыллё

**Цяпер у спажыўцоў вельмі папулярныя крамы са зніжкамі (стокі), а днямі падобная тэндэнцыя накрыла і рынак жыллёвай нерухомасці. Вось яго спецыялісты і склалі рэйтынг мінскіх вуліц, дзе прадаецца самае таннае жыллё.**

### У «ПРЫЗЁРАХ» ПЕРАДАВАЯ, СОЛТЫСА І КЛУМАВА

Топ-30 такога рэйтынгу ўзначальвае вуліца Перадавая, размешчаная каля Трактарнага завода. Аднапакаёвую кватэру там можна набыць за 43 тысячы долараў (645 млн рублёў), а некаторыя «двушкі» каштуюць каля 50 тысяч, як паведамляюць эксперты агенцтва нерухомасці «Твая сталіца».

**Намеснік начальніка аддзела ўпраўлення продажаў другаснага рынку жылля агенцтва Арцём ЧАРЦОЎ** тлумачыць нізкія цэны на гэтай вуліцы яе размяшчэннем уздоўж Мінскага трактарнага завода і чыгуначных шляхоў. Прамысловыя выкіды і пастаянны шум не найлепшым чынам адбіваюцца на прывабнасці раёна, адной з нямногіх добрых якасцяў якога выступае адносная блізкасць да цэнтра горада. Яшчэ адзін фактар — якасць самога жылля: вуліца «ўкамплектавана» дамамі 1970-х гадоў пабудовы з кампактнымі кватэрамі. Другое месца ў рэйтынгу займае вуліца Солтыса ў мікрараёне Дражня. Замыкае тройку яшчэ адзін прадстаўнік прамысловых кварталаў сталіцы — вуліца Клумава. Таннае жыллё лёгка знайсці на вуліцы Стралковай, размешчанай непадалёк ад чыгуначнай станцыі «Мінск-Усходні». За ёй ідзе вуліца Мініна, уздоўж якой размешчаны Мінскі завод сілікатных вырабаў і іншыя вытворчыя прадпрыемствы.



### І ДРУГАЯ «ПЯЦЁРКА» З ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ ПРАПІСКАЙ

Нізкія цэны на кватэры таксама характэрны для вуліц Шабаны і Ротмістрава, якія знаходзяцца ў адным з самых індустрыяльных мікрараёнаў горада.

Акрамя таго, нядорага абыходзіцца жыллё на вуліцы Куляшова каля станцыі метро «Аўтазаводская». Праблематычна прадаць кватэру па высокім кошце на вуліцы Ангарскай. У першую дзясятку самых танных вуліц Мінска таксама ўвайшла вуліца Асаналіева, якая суседнічае з Мінскім цагельным заводам, прадпрыемствам «Керамін» і кальцавой дарогай. За аднапакаёвыя кватэры на гэтых вуліцах у сярэднім просяць 45 тысяч, за двухпакаёвыя — 53-55 тысяч долараў.

### НЕЛІКВІД ЁСЦЬ І Ў «СПАЛЬНІКАХ»

Не сакрэт, што кватэры з нізкімі цэнамі шырока прадстаўлены ў такіх спальных раёнах, як Серабранка, Чыжоўка і Лошыца. Аднак увогуле найбольш танных кватэр размешчана ў Заводскім і Партызанскім раёнах. Асноўны фактар прывабнасці вуліцы — яе месцазнаходжанне. Вялікім попытам карыстаюцца месцы з развітой транспартнай і сацыяльнай інфраструктурай (крамамі, школамі, дзіцячымі садкамі, паліклінікамі), а рэзка зніжае сярэдні кошт «квадрата» на вуліцы суседства з буйным заводам і чыгуначнымі шляхамі.

Нізкія цэны на жыллё таксама звязаны з дамамі старой пабудовы. «На такіх вуліцах часта сустракаюцца кватэры з невялікімі пакоямі, нізкімі столямі і ў дрэнным стане — такім чынам, усё гэта адбіваецца на іх кошце. Пасля куплі такога жылля яшчэ трэба раскашэліцца на рамонт. Пры гэтым новабудоўлі на самых «танных» вуліцах горада сустракаюцца вельмі рэдка», — растлумачыў Арцём Чарцоў.

### «МЁРТВЫХ КВАРТАЛАЎ» У НАС НЯМА

Разам з тым, сёння ў найбуйнейшым мегаполісе краіны не існуе ярка выяўленага падзелу горада на багатыя і бедныя кварталы, як, напрыклад, у Парыжы, Нью-Ёрку ці Рыа-дэ-Жанейра. «У сталіцы, вядома, існуюць вуліцы і раёны, рынкавы кошт кватэр у якіх ніжэйшы, чым у сярэднім па горадзе, аднак попыт на жыллё прысутнічае ў розных частках горада — нейкіх сапраўды шэрых кропак у ім няма», — адзначыў эксперт.

### ПА СЯМЕЙНЫХ АБСТАВІНАХ

Кватэры на танных вуліцах у асноўным набываюць удзельнікі «ланцужкоў». Гэта звычайна вымушаныя пакупнікі. Калі сям'я раз'язджаецца, ёй неабходна атрымаць замест адной прасторнай дзве кампактныя кватэры, для чаго даводзіцца згаджацца на жыллё ў не самым прывабным месцы. Акрамя таго, могуць быць пераезды ў межах аднаго раёна — звычайна ў кватэры вялікіх плошчаў. «Сустракаюцца тут і «чыстыя» варыянты продажу, калі кватэры набываюць іншагароднія», — удакладняе сітуацыю спецыяліст. Аднак галоўным фактарам выбару падобнага жылля з'яўляецца даступны кошт.

### АБ ЭЛІЦЕ

Раней эксперты гэтага агенцтва склалі рэйтынг 30 самых дарагіх жылых вуліц Мінска. Першае месца ў ім заняла вуліца Піянерская: кошт «квадрата» ў ёй дасягае 4500 долараў, або 67,5 млн рублёў. Высокія цэны тут абумоўлены дамамі павышанай камфортнасці і наяўнасцю паблізу грамадска-дзелавых забудоў: спарткомплексу «Мінск-Арэна», бізнес-цэнтра са SPA Riviera Plaza і гандлёвага цэнтра «Арэна-Сіці». У пяцёрку таксама ўвайшлі вуліцы Язмінавая, Цяплічная, Парніковая і Ванькавічаў у квартале за Нацыянальнай бібліятэкай.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

# Што пасеем, тое і пажнём

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Механізатар Аляксандр Лебедзеў у сельскай гаспадарцы працуе чвэрць стагоддзя. Сёлетняя вясна, гаворыць, сапраўды, занадта ранняя, і зямля на Гомельшчыне вельмі сухая. Таму глебу трэба апрацоўваць вельмі якасна і хутка. Тут дапамогу вопыт і... воля да перамогі. Нездарма ж ён штодзень на працягу 30 гадоў пачынае раніцу з заняткаў гіравым спортам.

Цяпер вось апрабоўвае новенькую сеялку. Сваю былую машыну механізатар перадаў маладому механізатару, якога сам і рыхтаваў да няпростай працы ў полі.

— Не першы год сею, — кажа Аляксандр Міхайлавіч. — Надвор'е дазваляе, кормяць нас своечасова і смачна. Потым мне ж давядзецца і ўраджай з гэтага поля на камбайне прыбіраць. Як працуеш, так і плацяць. Больш папрацуеш — больш і атрымаеш.

Аляксандр Кастрама, дырэктар унітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Слаўмол», дзе, як і ва ўсім паўднёва-ўсходнім рэгіёне краіны, актыўна ідзе падрыхтоўка глебы і сяўба ранніх каласавых, гаворыць, што людзі добра разумеюць адказнасць, якая на іх ляжыць:

— У нашай гаспадарцы за год у тры разы павялічыўся аб'ём пасяўных плошчаў пад зерневы клін. Летась сеялі 700 га, сёлета — 2100. Людзі працуюць без выхадных, а энерганасычаная тэхніка па апрацоўцы глебы — у дзве змены, у тым ліку ноччу. Тэрміны сяўбы вельмі сціслыя і начныя змены — неабходнасць. Інакш не паспеем. Умовы калектыўнага дагавора ў нас вельмі добрыя для людзей, таму паразуменне ёсць. У нашай гаспадарцы за год прыбавілася 800 галоў буйной рагатай жывёлы. Усяго на 11 агароджаных фермах — каля 7400 галоў. Таму стаўку робім на стварэнне добрай кармавой базы — пад кукурузу сёлета значна пашыраем плошчы.

Чаго сапраўды баяцца аграрыі на Гомельшчыне — што і надалей не будзе дажджоў. Бясснежная зіма практычна не пакінула пасля сябе вільгаці. А яна проста неабходна для лёгкіх пясчаных земляў. Недахоп вільгаці адначасова з замаразкамі прывялі да таго, што ў асенне-зімовы перыяд практычна цалкам загінуў азімы рапс. Перасяваць плануюць кукурузай і раннімі зерневымі каласавымі. **Намеснік начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Гомельскага райвыканкама Мікалай ЛЯСЬКО** адзначае, што ніхто не сядзіць склаўшы рукі і не чакае ад нябёсаў толькі добрага надвор'я:

— Надвор'е — надвор'ем, але самае галоўнае — выкананне ўсіх агратэхнічных мерапрыемстваў. Важна, каб глеба была якасна падрыхтавана, каб насенне было пратраўлена... І паспець трэба ў аптымальна сціслыя тэрміны ўсё пасеяць. Калі гэта выканаем, думаю, будзем і сёлета з зернем. Плануем ужо з 12-15 красавіка пачаць масавую сяўбу кукурузы.



Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

У Гомельскім раёне пад яе плошчы адведзены вельмі вялікія. Калі ранния зерневыя займаюць 10 тысяч га па раёне, то кукуруза — 21 тысячу.

**Намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Іван СІДАРЭНКА** падкрэслівае, што гаспадаркі Гомельскай вобласці плануюць завяршыць сяўбу ранніх збожжавых культур да 5 красавіка.

— У нас сёння вялікіх праблем на сяўбе няма ўвогуле. Усё ідзе арганізавана, па плане. У канцы першай дэкады красавіка неабходна пачынаць сяўбу нашай галоўнай культуры — кукурузы. Гэта значыць, трэба вызваліць да гэтага часу максімальную колькасць людзей і тэхнікі. Асноўны ўраджай збожжа сёлета на Гомельшчыне плануем атрымаць за кошт яравых збожжавых і кукурузы. Наша мэта — сабраць зерня не менш, чым летась, калі ўпершыню ў гісторыі яго намалот у Гомельскай вобласці склаў больш за 1,5 млн тон.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Управляющая компания холдинга «Бобруйскагромаш» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже**

**изолированного помещения столовой,**

**инвентарный номер 710/D-68145, общей площадью 2205,2 кв.м, расположенного по адресу: Могилёвская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 5, на земельном участке пл. 0,1650 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования.**

**Начальная цена с НДС 20% – 6 080 892 000 белорусских рублей.**

*Задаток 10% от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».*

**Имущество обременено договором ипотеки в ЗАО «Альфа-Банк».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **20** (двадцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за предмет аукциона производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

*Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 18.12.2014 г.*

Аукцион состоится **28.04.2015** в 14.00 по адресу: **г. Бобруйск, ул. Шинная, 5, ОАО «Управляющая компания холдинга «Бобруйскагромаш».** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.04.2015** до 17.00 по адресу: г. Минск, **ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**


■ Ну і ну!

## ПАСПРАБАВАЎ ВЫЦЯГНУЦЬ «ШЧАСЛІВЫ БІЛЕТ»...

**У Наваполацку мужчына скраў з кіёска 400 латарэйных білетаў і... раздаў іх мінакам.**

Ранкам у праваахоўныя органы звярнулася прадавец прадпрыемства «Беларускія нацыянальныя латарэі»: невядомы трапіў унутр кіёска — зніклі чатыры сотні розных латарэйных білетаў. Следча-аператыўная група знайшла на месцы здарэння сляды пальцаў на разбітым аконным шкле. Іх «прабілі» па базе даных — і неўзабаве супрацоўнікі міліцыі ўжо ехалі да месца жыхарства магчымага злачынцы. Па падазрэнні ў крадзяжы быў затрыманы 28-гадовы жыхар Расонскага раёна, які прыехаў у Наваполацк у госці да знаёмай.

Паводле інфармацыі ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці, падазраваны раней быў судзімы за здзяйсненне маёмасных злачынстваў. У момант крадзяжу мужчына знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. Устаноўлена, што падазраваны меў намер скрасці з кіёска грошы, аднак не знайшоў іх там. Тады вырашыў забраць латарэйныя білеты, якія потым проста раздаў мінакам. Па факце заведзена крымінальная справа, прызначаны шэраг судовых экспертыз.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПАД «ШЫЛЬДАЙ»... МЕТАЛУ

**Найбуйнейшую ў гэтым годзе партыю тытунёвай кантрабанды затрымалі супрацоўнікі Гродзенскай рэгіянальнай мытні на беларуска-літоўскай мяжы ў пункце пропуску «Прывалка».**

Аўтамабіль польскай фірмы, за рулём якога быў грамадзянін Беларусі, накіроўваўся за межы тэрыторыі Мытнага саюза з грузам, што быў пазначаны ў дакументацыі як «металічныя пруткі». Аднак інспекцыйна-наглядальны комплекс, які цяпер ёсць у мытнікаў дзякуючы праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Латвія — Літва — Беларусь», падмануць не ўдалося. Сканіраванне грузавіка паказала, што пад «шыльдай» вырабаў з металу перавозяцца нелегальныя цыгарэты — 699 тысяч пачкаў коштам больш за 4,6 мільярда рублёў. А для імітацыі вагі «металічных пруткоў» выкарыстоўваліся бардзюрныя пліты.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

# ПАКАЗАННІ ДА ПРЫМЯНЕННЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Айчынная фармацэўтычная прамысловасць дасягнула добрых вынікаў за апошнія 10 гадоў. Складанасць была ў тым, што яна прыйшла на сфарміраваны рынак і сфарміраванае стаўленне насельніцтва да імпартнага і айчыннага тавару. Да новых удзельнікаў з'явілася шмат пытанняў па доказе эфектыўнасці, якасці і бяспекі. У дачыненні ж да ўдзельнікаў, якія ўжо прысутнічалі на рынку, гэтыя пытанні не задаюцца, хоць, безумоўна, бясшкодных лекаў не існуе.

— Важна данесці да медыкаў інфармацыю пра новыя распрацоўкі, — лічыць **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Алена БОГДАН**. — Рэспубліканскія і міжнародныя канферэнцыі ў нашай краіне заўсёды прадугледжваюць выступленні прадстаўнікоў маркетынгавых службаў прадпрыемстваў, аднак міністэрства пры ўсім жаданні не збярэ на сваю канферэнцыю 32 тысячы ўрачоў, якія працуюць у сістэме аховы здароўя. Таму такая работа павінна праводзіцца па ўсёй «вертыкалі». Для стварэння сістэмы інфармавання ўрачоў і быў падрыхтаваны загад «Аб прасоўванні айчынных лекавых сродкаў у арганізацыях аховы здароўя».

**Са стварэннем у 2016 годзе ў ЕАЭС адзінага рынку лекаў і медыцынскіх вырабаў унутраная канкурэнцыя паміж фармвытворцамі можа ўзрасці, але нашы прадпрыемствы гатовы да работы ў новых умовах.**

Асноўная палітыка па прыхільнасці пацыента да лячэння праводзіцца ўрачамі пярвічнага звяна на ўзроўні цэнтральных раённых бальніц, паліклінік — там, дзе ўдзельная вага айчынных лекаў складае 80-90 працэнтаў. Гэта аб'ектыўны паказчык таго, што нашы лекі дзейнічаюць.

— На распрацоўку арыгінальных лекавых сродкаў неабходны каласальныя затраты — фінансавыя і часовыя. Гэта могуць сабе дазволіць буйныя фармкарпарацыі. Таму большасць краін свету ідзе па шляху вытворчасці аналагаў арыгінальных прэпаратаў — генерыкаў. Генерычныя лекавыя сродкі не ўключаюць у сябе поўны аб'ём кошту ўсіх клінічных іспытаў, этапаў навуковай распрацоўкі, таму іх кошт аказваецца на прымальным для сістэмы аховы здароўя і пацыента ўзроўні. Усе краіны імкнуцца максімальна павысіць узровень выпуску генерычных лекавых сродкаў, каб забяспечыць доступ насельніцтву да меддапамогі, — патлумачыла **намеснік загадчыка клініка-фармакалагічнай лабараторыі Рэспубліканскага цэнтра экспертыз і іспытаў у ахове здароўя Святлана СЕТКІНА.**

Заканадаўства вызначае ўзровень патрабаванняў да генерычных лекаў — той жа, што вызначаецца ў іншых краінах. Мы не робім ніякіх выключэнняў для генерыкаў, зыходзячы з таго, дзе яны выраблены. Яны павінны прайсці поўны аб'ём патрабуемых іспытаў да таго, як могуць быць зарэгістраваны. Вытворца мае права распрацаваць склад з выкарыстаннем дапаможных рэчываў, якія могуць у пэўнай ступені адрозніваццца ад арыгінальнага прэпарату. Яго задача — даказаць, што і пры гэтым складзе прэпарат эквівалентны.

Як адзначалася падчас канферэнцыі, у нас распрацоўваюцца і арыгінальныя лекавыя прэпараты, большасць іх — для лячэння онказахворванняў. Адным з такіх з'яўляецца фаталон, які ўжываецца не толькі ў Беларусі. Летась на ўнутраным рынку было асвоена 158 найменняў лекавых сродкаў, з іх 15 адносяцца да катэгорыі арыгінальных.

Больш за 150 тысяч замежных грамадзян атрымалі меддапамогу ў беларускіх установах аховы здароўя ў мінулым годзе. Розніцы ў лячэнні айчынных і замежных грамадзян у клінічных пратаколах няма. Апошніх, як і беларусаў, лечаць айчыннымі прэпаратамі.




Пабочная рэакцыя — неад'емная частка любога лекавага сродку. І айчыннага, і замежнага. Лекі не абсалютна бяспечныя, але карысць ад іх ужывання пераважае рызыку.

Тыя патрабаванні да якасці, якія сёння прад'яўляюцца ў Беларусі, адпавядаюць па ўсіх параметрах патрабаванням Еўрапейскай фармакапеі. Гэта вельмі высокі ўзровень патрабаванняў і да дзеючага рэчыва, і да тых жа прымесяў. Усе кампаненты, якія ўваходзяць у склад лекавых сродкаў, кантралююцца ў адпаведнасці з высокім узроўнем стандарту — Дзяржаўнай фармакапеяй. Яна адаптуецца і абнаўляецца паводле змяненняў Еўрапейскай фармакапеі. Так, калі выводзіцца новы генерычны прэпарат, сістэма кантролю якасці і сістэма рэгістрацыі не дапусціць, напрыклад, вялікай колькасці прымесяў.

## Пра цэны

**Цэны на лекі паднімаюцца толькі па тых найменнях, дзе новая субстанцыя аказалася больш дарагой, чым папярэдняя. Кошт лекаў без замежнага складніка не расце.**

**Пад рэгуляваннем дзяржавы засталося 35 найменняў лекавых сродкаў (раней іх было звыш 180). Гэта тыя лекі, што востра запатрабаваны на ўнутраным рынку, і тыя, па якіх у нас мінімальная або нават адмоўная рэнтабельнасць.**

Усе беларускія фармпрадпрыемствы атрымаюць да 2016 года сертыфікаты GMP. Гэта дазволіць адгружаць прадукцыю ў тыя краіны, дзе раней нашы пастаўшчыкі не прысутнічалі. Са стварэннем у 2016 годзе ў ЕАЭС адзінага рынку лекаў і медыцынскіх вырабаў унутраная канкурэнцыя паміж фармвытворцамі можа ўзрасці, але нашы прадпрыемствы гатовы да работы ў новых умовах. На ўсіх вытворчых участках выкарыстоўваецца самае сучаснае тэхналагічнае, вытворчае і лабараторнае абсталяванне.

— Сёння ў аптэках няма дэфіцыту лекаў айчыннай і замежнай вытворчасці. Ёсць асобныя перабоі ў пастаўках імпартных лекавых сродкаў, што можа быць звязана з працэсам перарэгістрацыі, калі замежны вытворца своечасова не прадаставіў неабходныя дакументы, або з працэсам вырабу гэтых сродкаў, — падкрэсліў **генеральны дырэктар прадпрыемства «Белфармацыя» Ігар КАВАЛЬЧУК.**

Пытанне замены імпартнага прэпарату, якога часова няма, вырашаецца аператыўна. У першую чаргу правізары ў аптэцы прапануюць айчынныя лекі — яны заўсёды ёсць у дастатковай колькасці, дзякуючы мінімальным тэрмінам дастаўкі. Арганізацыі аховы здароўя забяспечваюцца лекамі айчыннай і замежнай вытворчасці бесперабойна на аснове штодзённай дастаўкі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ На кантролі

# Правядзём меліярацыю і ...

## Колькі ж мяса і малака атрымаем?

**Такім пытаннем зацікавіліся спецыялісты Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці пасля знаёмства з заяўкамі сельгаспрадпрыемстваў на меліярацыю.**

Аказалася, што ў большасці з іх няма галоўнага — абгрунтавання эканамічнай мэтазгоднасці гэтых работ. Вось, напрыклад, заяўка на рэканструкцыю меліяратыўнага ўчастка плошчай 220 гектараў у СВК «Місевічы» Воранаўскага раёна. Невядома, колькі мяса і малака збіраюцца атрымаць з гэтых земляў, якога прыбытку чакаюць і які тэрмін акупнасці праекта.

Камітэт дзяржкантролю выбарачна абследаваў меліяраваныя землі і выявіў, што каля 400 гектараў належнага эфекту не даюць. Хоць на іх затрачана 2,7 мільярда рублёў з бюджэту. Напрыклад, у СВК «Нягневічы» Навагрудскага раёна пасля рэканструкцыі ў 2009 годзе меліярацыйнай сістэмы «Занёманская» не выкарыстоўваюць 110 гектараў: плошча зарастае хмызняком, шматгадовыя травы не скошваюцца.

Акрамя таго, практычна ўсюды ігнаруюцца патрабаванні праектнай дакументацыі наконт выкарыстання асушаных зямель. Скажам, замест прадугледжанай сенажаці вырошчваюць азімыя і кукурузу. Аб навукова абрунтаваным севазвароце з улікам спецыфікі меліяраваных сельгасугоддзяў часта не думаюць. Не наладзілі і сістэму ўліку прадукцыйнасці, валавай вытворчасці і кошту прадукцыі з канкрэтных зямельных участкаў. А значыць, не разбярэшся, якая аддача ад бюджэтных сродкаў.

Дарэчы, землеўпарадкавальныя службы райвыканкамаў за два апошнія гады не ўстанавілі ніводнага парушэння заканадаўства ў выкарыстанні меліяраваных земляў. Што і не дзіўна, паколькі праверак па гэтым пытанні не было.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ На слыху

# ЮРАСОБЫ МАЮЦЬ ШАНЦ НА КАМПЕНСАЦЫЮ

## А крэдыты давядзецца выплачваць

**Сітуацыя з юрыдычнымі асобамі, якія з'яўляюцца кліентамі Дэльта Банка, праясніцца на працягу месяца. Пра гэта заявіў кіраўнік яго часовай адміністрацыі Аляксандр ПЯДЗЬКО.**

У дадзены момант, у адпаведнасці з Банкаўскім кодэксам, банк прыпыніў выкананне абавязацельстваў перад юрыдычнымі асобамі. «Цяпер аналізуецца сітуацыя, каб зразумець, ці дастаткова ва ўстановы актываў для выканання сваіх абавязацельстваў, прызначана інвентарызацыя. На працягу месяца будзе вырашана пытанне з ацэнкай рэальнага фінансавага стану банка і адпаведныя прапановы намі будуць унесены», — адзначыў Аляксандр Пядзько.

Што да крэдытаатрымальнікаў Дэльта Банка, то з імі сітуацыя зразумелая. Фінансавая ўстанова па-ранейшаму абслугоўвае крэдытны партфель як фізічных, так і юрыдычных асоб. «Усе грашовыя сродкі, якія яны пералічылі, будуць залічаны ў лік пагашэння абавязацельстваў па крэдытных дагаворах».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**


ИЗВЕЩЕНИЕО ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже производственной базы,**

**расположенной в Витебской обл., Городокский р-н, г.п. Езерище.**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703 |
| **Продавец** | **ОАО «УМ-88»,** г. Минск, ул. Промышленная, 23. |

**Предмет аукциона (объекты недвижимости реализуются одним лотом):**

| Наименование | Общ. площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| Здание мастерских | 393,2 | 201/С-13970 | г.п. Езерище, ул. Ленинская, д. 2 |

Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции);

| Наименование | Общ. площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| Здание пилорамы | 581 | 201/С-13969 | г.п. Езерище, ул. Ленинская, 2/1 |

Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель.

| Наименование | Общ. площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| Одинарный блок-контейнер | 26,6 | 201/С-13971 | г.п. Езерище, ул. Ленинская, 2/2 |

Назначение: здание неустановленного назначения. Составные части и принадлежности: тамбур, сарай, уборная.

В состав имущества входит резервуар емк. 25 м³, инвентарный номер по бух. учету 13275.

**Сведения о земельном участке:** Кадастровый номер: 221855300001000833. Адрес: Витебская обл., Городокский р-н, гп Езерище, ул. Ленинская, д. 2. **Площадь (га): 1,2540.** Категория: Земли населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов. Целевое назначение: Земельный участок для использования под производственную базу. Предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Ограничения (обременения): охранная зона ЛЭП напряжением до 1000 В., площадь 0.0420 га.

**Начальная цена с НДС – 1 176 505 200 белорусских рублей.**

**Задаток 10%** от начальной цены лота перечисляется: в белорусских рублях на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за предмет аукциона производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **30.04.2015** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.04.2015** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ

**Государственное учреждение**
**«Республиканский культурно-просветительный центр»**
**Управления делами Президента Республики Беларусь**

**проводит аукцион на право заключения договора аренды сроком на 3 года помещения №203а, площадью 7,4 м. кв.,**

**находящегося на втором этаже здания по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5.**

**Аукцион состоится 27.04.2015 г. в 10.30 в ауд. 414 в г. Минске, ул. Октябрьская, 5.**
**Прием заявлений на участие принимаются до 17.00 24.04.2015 года по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5, 3 эт., каб. 319/2.**

Для участия в аукционе участник представляет: копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка размером 22 015 рублей на расчетный счет №3632900003184 в филиале №510 АСБ «Беларусбанк», код 603 УНН 100650172 ГУ «Республиканский культурно-просветительный центр» Управления делами Президента Республики Беларусь, не позднее 24.04.2015 года.

**Для уточнения и получения дополнительной информации звонить по телефону: 328-54-73.**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Витебский завод электроизмерительных приборов» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества, в составе:**

**Лот № 1:**

| Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|
| 200/С-50253 | производственный корпус № 3 (в т.ч. кран-балка, инв. № 143798). | 808,5 кв.м | г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/1 |

**Начальная цена с НДС 20% – 3 653 838 980 бел.руб.**

**Лот № 2:**

| Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|
| 200/С-43676 | корпус № 7 (складской) | 521 кв.м | г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/3 |

**Начальная цена с НДС 20% – 696 000 000 бел.руб.**

**Лот № 3:**

| Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|
| 200/С-43770 | корпус №15 (ДОК) | 351,6 кв.м | г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/4 |

**Начальная цена с НДС 20% – 210 000 000 бел. руб.**

Лоты № 1–3 расположены на земельном участке пл. 3.1357 га, предоставленному продавцу для содержания и обслуживания производственных помещений. Данный земельный участок признан неделимым и при реализации недвижимости предоставляется в общую долевую аренду.

**Лот № 4:**

База отдыха «Вышедки», расположенная по адресу: Витебская область, Городокский район, Стодолищенский с/с, 0,5 км южнее д. Вышедки, 1, в составе:

| № п/п | Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь |
|---|---|---|---|
| 1 | 201/С-10553 | корпус № 1 | 52 |
| 2 | 201/С-10554 | корпус № 2 | 51,3 |
| 3 | 201/С-10555 | корпус № 3 | 51,7 |
| 4 | 201/С-10556 | корпус № 4 | 51,2 |
| 5 | 201/С-10557 | корпус № 5 | 50,9 |
| 6 | 201/С-10558 | корпус № 6 | 52 |
| 7 | 201/С-10559 | корпус № 7 | 75,3 |
| 8 | 201/С-12691 | здание неустановленного назначения | 23 |
| 9 | 201/С-12692 | туалет | 3,1 |

А также: воздушная линия электропередачи ВЛ-10 кВ, протяженность 945 м.п., инвентарный номер 201/С-12702, с трансформаторной подстанцией КТП; наружное освещение инвентарный номер 201/С-12689;

Земельный участок площадью 1,9683 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для использования под базу отдыха. Земельный участок пл. 1,0141 га предоставлен продавцу на праве аренды по 28.07.2060, для содержания и обслуживания воздушной линии ВЛ-10; Земельный участок пл. 0,0293 га, предоставлен продавцу на праве аренды по 28.07.2060, для содержания и обслуживания КТП-568. Земельные участки имеют ограничения в пользовании – водоохранная зона вне прибрежной полосы озера Вышедское.

**Начальная цена с НДС 20% – 805 070 400 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи по Лотам № 1-3 должен быть подписан в течение **20** (двадцати) рабочих дней после согласования проекта договора купли-продажи с ОАО «БПС-Сбербанк», в связи с наличием обременения по Лотам № 1–3 в пользу ОАО «БПС-Сбербанк» (ипотека). Договор купли продажи по Лоту № 4 должен быть подписан в течение **20** (двадцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты недвижимости производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 16.01.2015.*

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и фактических затрат на организацию и проведение аукциона оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**.

Аукцион состоится **15 апреля 2015** года в 14 ч.00 мин. по адресу: г. Витебск, ул. Ильинского, 19/18, корпус №8, 3-ий этаж, помещение 309. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13 апреля 2015** года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71. auction@cpo.by. www.cpo.by.**

# ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

26 САКАВІКА 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 6 (15765)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

**MUZZART:**

# «У цуды не верым, а робім іх самі»



**Адметныя рысы гурта MUZZART — майстэрства, эмоцыі і запал. І гледзячы, як удзельнікі дэманструюць гэта на сцэне, ім верыш, адгукаешся на іх заклік весяліцца і радавацца. Група мае ў спісе сваіх заваяванняў перамогі на шматлікіх міжнародных конкурсах і фестывалях у Італіі, Украіне, Польшчы, прыхільнікаў у розных краінах свету. А ў наступным годзе ўжо адзначыць дзесяцігоддзе творчай дзейнасці. Каманда, у якую сёння ўваходзяць браты Уладзімір і Аляксандр Круцікавы, Яўген Лук'янчык, Вячаслаў Пляско, Яна Буцкевіч і Ілья Церашчук — музыканты-віртуозы. І яны працягваюць спробы па-новаму заявіць пра сябе. Мы сустрэліся з трыма ўдзельнікамі калектыву, каб пагутарыць пра тое, як уплывае на поспех месца жыхарства, ці магчыма музыкай зарабляць і якой публіцы яны рады на сваіх канцэртах.**

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Гарызонты

# ПАЎКІЛАМЕТРА ПАД ЗЯМЛЁЙ,

## або Соль і хлеб шахцёрскай прафесіі

**Сярод усіх беларускіх гарадоў Салігорск вылучаецца, пэўна, тым, што сімвалізуе сабой маладосць. Сапраўды, гораду-статысячніку ўсяго толькі крыху больш за пяцьдзясят гадоў, а ён працягвае расці і развівацца. Узяць хоць бы «Беларуськалій» — адзін з найбуйнейшых у свеце вытворцаў калійнай солі... Сярод яго супрацоўнікаў нямала моладзі. Як працуюць шахцёры новага пакалення, карэспандэнты «Чырвонкі» даведаліся ў 21-гадовага Ільі ХРАМЯНКОВА.**



На працы...

— Нягледзячы на тое, што Салігорск — шахцёрскі горад, у дзяцінстве я не марыў аб працы пад зямлёй, — кажа Ілья. — Найбольш мяне цікавіў футбол. Але пасля атрыманай траўмы давялося з ім заканчваць. Цяпер гуляю толькі за зборную рудаўпраўлення.

Пасля заканчэння кароткай кар'еры футбаліста перад хлопцам паўстала пытанне: што рабіць далей?

— Мой бацька — ветэран працы, працуе на шахтах ужо 22 гады. Менавіта па яго парадзе я і паступіў у наш горна-хімічны каледж яшчэ ў той час, калі займаўся футболам. Дарэчы, не сказаў бы, што вучыцца там проста. У каледжы шмат профільных прадметаў (інжынерная графіка, распрацоўка радовішчаў, тэхнічная механіка), многа матэматыкі. Нават менеджментам займаліся — разлічвалі акупнасць шахты, складалі бізнес-планы. Адвучыўся чатыры гады і пайшоў працаваць. Мая спецыяльнасць — «горны тэхнік-тэхнолаг», вось ужо паўтара года працую мацавальнікам на Краснаслабодскім рудніку 2-га рудаўпраўлення, які яшчэ ўмоўна называюць пятым, — расказвае Ілья.

Першыя працоўныя будні, па словах хлопца, праходзілі вельмі цяжка. Кажа, што напачатку вельмі складана прызвычаіцца да таго, што кожны працоўны дзень ты праводзіш пад зямлёй. Штодзённая «цырымонія» спуску, буйная тэхніка ў невялікіх памяшканнях — усё гэта цісне на псіхіку.

— Гэта цяпер я ўжо нічога не адчуваю, спускаючыся ў шахту, — прызнаецца хлопец. — А раней калі бачыў, як пад зямлёй рухаецца вялізны аўтамабіль для горна-здабыўных работ, эмоцыі былі неверагодныя.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

Абмяркуем

**Міхаіл ЖУРАЎКОЎ:**

# «СТУДЭНЦКАЕ САМАКІРАВАННЕ — НЕ АДНАБАКОВЫ РУХ»

**«Дзе вы чэрпаеце натхненне і што дапамагае вам не адступаць перад цяжкасцямі?» — такое нечаканае пытанне задалі міністру адукацыі Міхаілу ЖУРАЎКОВУ ўдзельнікі сустрэчы кіраўніка галіны са студэнцкім прафсаюзным актывам.**

— А вы ведаеце, чаму прафесары заўсёды добра выглядаюць? Таму што падсілкоўваюцца энергіяй маладых, — пажартаваў міністр. — А калі больш сур'ёзна, то трэба быць заўсёды пазітыўным. Я веру, што нашы думкі матэрыялізуюцца, а пазітыўны чалавек прыцягвае да сябе такіх жа пазітыўных людзей.



Сустрэча міністра з прафсаюзнымі актывістамі з кола студэнтаў адбылася напярэдадні VIII з'езда Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Пытанні і праблемы ўзнімаліся самыя розныя — ад мадэрнізацыі вышэйшай школы і канкурэнтаздольнасці беларускіх ВНУ да «каменданцкай гадзіны» ў інтэрнатах і прыцягнення студэнтаў да рознага роду работ, не звязаных з навучальным працэсам.

## З «ПЛАТНІКАЎ» — У «БЮДЖЭТНІКІ»

**Старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БНТУ Сяргей КАМАДЗЕЙ** з гонарам адзначыў, што студэнцкі прафсаюз — унікальная арганізацыя, якая дзейнічае ў інтарэсах студэнтаў і мае магчымасць гаварыць на роўных як з кіраўніцтвам універсітэта, так і са студэнтамі. Прафсаюз уключае сваіх прадстаўнікоў ва ўсе ўніверсітэцкія камісіі, праца якіх закранае пытанні вучэбна-выхаваўчага працэсу і стыпендыяльнага забеспячэння, сацыяльныя і жыллёва-бытавыя пытанні. Прафсаюзу ўдаецца трымаць руку на пульсе, разумець інтарэсы студэнтаў і супастаўляць іх з магчымасцямі кіраўніцтва. Можна сказаць, што фактычна ніводнае рашэнне, якое прымаецца ў дачыненні да студэнтаў, не абыходзіцца без узгаднення з прафсаюзам.

Лідар пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БНТУ звярнуў увагу на наступную праблему:

— Сёння нас турбуе сітуацыя са студэнтамі, што навучаюцца на платнай аснове, якія страцілі апошняга з бацькоў у час сваёй вучобы. Аплата за навучанне становіцца для іх непасільнай ношай. Перавесці такіх студэнтаў на навучанне за кошт сродкаў бюджэту законных падстаў няма, як не заўсёды можна прадаставіць ім і зніжку па аплаце за навучанне. Кожная ВНУ самастойна спрабуе вырашаць праблемы сірот. Лічым, што гэтае пытанне патрабуе ўсё ж вырашэння на ўзроўні Міністэрства адукацыі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# «СТУДЭНЦКАЕ САМАКІРАВАННЕ — НЕ АДНАБАКОВЫ РУХ»

*(Заканчэнне.*
***Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

На думку прафсаюзных лідараў, трэба даць установам адукацыі права пры наяўнасці бюджэтных вакансій пераводзіць такіх студэнтаў, якія паспяхова спраўляюцца з вучобай, на навучанне за кошт сродкаў бюджэту.

## ФІНАНСАВЫЯ НЮАНСЫ АЗДАРАЎЛЕННЯ

Адзін з напрамкаў працы прафсаюза — аздараўленне студэнтаў. Важную ролю ва ўсе часы адыгрывалі універсітэцкія санаторыі-прафілакторыі. Аднак сітуацыя з імі складваецца не самая простая. З 1 студзеня 2015-га было прынята рашэнне аб павелічэнні датацыі на аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне студэнтаў у студэнцкіх санаторыях-прафілакторыях з 53 200 рублёў да 61 700 рублёў (на 16%) на адзін ложка-дзень. Пры гэтым датацыя на заработную плату з налічэннямі павялічылася з 18 240 рублёў да 21 150 рублёў на адзін ложка-дзень.

Прадугледжанага фінансавання для нармальнага функцыянавання студэнцкіх санаторыяў-прафілакторыяў недастаткова. (Напрыклад, у студэнцкім санаторыі-прафілакторыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта дэфіцыт фінансавых рэсурсаў у гадавым фондзе аплаты працы складзе 258,8 млн рублёў.)

Няпростая сітуацыя складваецца і ў адзіным студэнцкім санаторыі-прафілакторыі з кругласутачным знаходжаннем — размова ідзе пра студэнцкі санаторый-прафілакторый БНТУ «Палітэхнік». Сёння ён дае магчымасць аздаравіцца без адрыву ад вучэбных заняткаў. І ёю карыстаюцца студэнты ўсіх сталічных вышэйшых навучальных установаў. Санаторый размешчаны на беразе Заслаўскага вадасховішча. Пражываюць там студэнты ў камфартабельных двухмесных нумарах, для іх арганізавана чатырохразовае харчаванне, на вучобу дастаўляюць камфартабельныя аўтобусы. Санаторый мае велізарны патэнцыял як у плане аздараўлення студэнтаў, так і ў плане арганізацыі на яго базе семінараў, спаборніцтваў, студэнцкіх злётаў і іншых яркіх мерапрыемстваў. Але, паводле слоў Сяргея Камадзея, складана рэалізаваць гэты патэнцыял у поўнай ступені без фінансавай падтрымкі Міністэрства адукацыі: без абнаўлення матэрыяльна-тэхнічнай базы санаторыя, без укаранення новых медыцынскіх працэдур...

## УШЧЫЛЬНЕННЕ ІНТЭРНАТАЎ

Адна з самых вострых праблем студэнцтва — недахоп месцаў для пражывання ў інтэрнатах. Працэнт забяспечанасці месцамі ў інтэрнатах мінскіх ВНУ досыць нізкі. У шэрагу ўстаноў адукацыі на падставе афіцыйных дазволаў санітарных службаў ажыццяўляецца засяленне звыш санітарных нормаў. Важным крокам у вырашэнні гэтай праблемы стала будаўніцтва студэнцкай вёскі, аднак пытанне недахопу месцаў да гэтага часу не знята з парадку дня. Тысячы студэнтаў вымушаны самастойна вырашаць праблему з пошукам жылля. Каб часткова змякчыць праблему з дэфіцытам месцаў у інтэрнатах, прафсаюзныя арганізацыі збіраюцца і бясплатна даваць студэнтам інфармацыю пра адрасы кватэр і пакояў, што здаюцца ў наём.

Адкрытым застаецца пытанне аб кампенсацыі за наём жылля іншагароднім навучэнцам. Сёння студэнтаў, якія скарысталіся гэтай магчымасцю, у кожнай ВНУ можна палічыць на пальцах адной рукі.

**«У той ці іншай форме студэнцкае самакіраванне прысутнічае ў кожным універсітэце, аднак ні агульнага палажэння па студэнцкім самакіраванні, ні заканадаўчага замацавання гэтага паняцця няма».**

Цяпер памер кампенсацыі складае 3 базавыя велічыні ў Мінску (540 тысяч рублёў) і 2 базавыя велічыні (360 тысяч рублёў) у іншых населеных пунктах. Умовай для яе атрымання з'яўляецца сярэднедушавы даход сям'і студэнта, які не павінен перавышаць 200% найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму за два апошнія кварталы (2 млн 856 тысяч 200 рублёў на чалавека).

Таму прафсаюз прапануе прыняць рашэнне аб стварэнні рэальна дзейнага механізму кампенсацыі выдаткаў па найму жылля іншагароднім навучэнцам. Вырашыць гэту праблему можна з дапамогай вызвалення ад падаходнага падатку грамадзян, якія здаюць у наём жылыя памяшканні іншагароднім студэнтам і навучэнцам. (Такая прэферэнцыя дзейнічае ў дачыненні да тых, хто прадастаўляе жыллё ў арэнду маладым спецыялістам.) Аднак пакуль яна застаецца нявырашанай.

Хвалюе студэнтаў і апярэджанне тэмпаў росту кошту пражывання ў інтэрнатах над тэмпамі росту памеру іх стыпендый.

— У многіх краінах свету праблема забеспячэння студэнтаў жыллём — не задача адміністрацыі ўніверсітэтаў, а галаўны боль саміх студэнтаў. Наша дзяржава — сацыяльна-арыентаваная, таму па меры магчымасцяў, новыя студэнцкія інтэрнаты будуюцца. І гэта пры тым, што ўзвядзенне такіх аб'ектаў вымагае вялізных сродкаў, — падзяліўся сваім бачаннем праблемы міністр. — Хацелася б і большага разумення ў пытаннях «ушчыльнення засялення» з боку студэнтаў і іх бацькоў. Каб тыя не абураліся, калі мы ў пакой з двума студэнтамі вымушана падсяляем трэцяга. Бо добра толькі тым двум, хто ўжо мае дах над галавой. А што рабіць трэцяму, каму не хапіла ложка ў інтэрнаце?

## ДАМОКЛАЎ МЕЧ

Не ўсе студэнты задаволены і перспектывамі свайго размеркавання, асабліва калі размеркаванне становіцца перашкодай для працягу навучання ў магістратуры за межамі Беларусі. Па цяперашніх правілах, каб не вяртаць сродкі за сваю вучобу ў бюджэт, неабходна паступіць у магістратуру на бюджэтную форму навучання ў год заканчэння першай ступені вышэйшай школы, прычым у магістратуру беларускай ВНУ.

— Чамусьці апаненты ідэі размеркавання не прыгадваюць досвед іншых краін, дзе таксама, калі малады чалавек хоча атрымаць дзяржаўную стыпендыю ці крэдыт на навучанне, ён павінен паехаць працаваць туды, куды яму скажуць, — парыраваў міністр. — У ЗША, калі не хапала педагагічных кадраў, быў аб'яўлены спецыяльны набор: на прыродазнаўча-навуковых і матэматычных факультэтах адбіралі здольных студэнтаў, якім далі дадатковыя веды па педагогіцы і псіхалогіі, выплачвалі ім стыпендыю, а затым урад накіроўваў іх на пяць гадоў туды, дзе ў педагогах адчувалася асабліва вострая патрэба.

Хачу заўважыць, што сёння хапае студэнтаў платнай формы навучання, якія просяць прадаставіць ім першае працоўнае месца. І не ўсе наймальнікі радуюцца маладым спецыялістам, бо на іх гэта накладае дадатковыя абавязацельствы. Яны не могуць на працягу двух гадоў звольніць маладога спецыяліста, які прыйшоў да іх, і не могуць перавесці яго на іншую пасаду. А што тычыцца навучання ў магістратуры замежнай ВНУ, то яно магчыма ў тым выпадку, калі ў беларускай ВНУ заключана пагадненне з замежным універсітэтам пра так званае ўключанае навучанне.

Міхаіл Жураўкоў выказаў упэўненасць, што ў выпадку далучэння Беларусі да Балонскага працэсу сістэма ўключанага навучання будзе пашырацца, а мабільнасць беларускіх студэнтаў будзе расці...

## НЕ ТОЛЬКІ ПРАВЫ, АЛЕ І АБАВЯЗКІ

«Адной з умоў далучэння да Балонскага працэсу з'яўляецца наяўнасць органаў студэнцкага самакіравання. У той ці іншай форме студэнцкае самакіраванне прысутнічае ў кожным універсітэце, аднак ні агульнага палажэння па студэнцкім самакіраванні, ні заканадаўчага замацавання гэтага паняцця няма», — звярнулі ўвагу міністра на яшчэ адну праблему студэнты. Увогуле, Кодэкс аб адукацыі змяшчае недастаткова канкрэтных фармулёвак, якія датычацца правоў студэнтаў на іх удзел у кіраванні сваёй ВНУ. Сёння арганізацыі студэнцкага самакіравання не маюць статусу юрыдычнай асобы, а значыць, у прававым плане яны залежаць ад адміністрацыі ўніверсітэта. Што да фінансавай незалежнасці органаў студэнцкага самакіравання, то яна таксама нідзе не занатавана. Напрыклад, ва ўкраінскіх ВНУ фінансавай асновай студэнцкага самакіравання з'яўляюцца сродкі ў памеры не менш як 0,5 працэнта ад сродкаў спецыяльнага фонду ВНУ.

Паколькі органы студэнцкага самакіравання не валодаюць статусам юрыдычнай асобы, яны пазбаўлены магчымасці прыцягнення спонсарскай дапамогі, атрымання ахвяраванняў і ўзносаў, а таксама паступленняў ад праведзеных мерапрыемстваў. А фінансавая залежнасць абумоўлівае залежнасць арганізацыйную...

— Сапраўды, калі мы жадаем бачыць сябе ў Балонскім працэсе, адно з пажаданняў экспертаў — больш актыўны ўдзел студэнтаў у кіраванні ўніверсітэтамі, — пагадзіўся Міхаіл Жураўкоў. — Але я лічу, што тут шмат залежыць ад вашай ініцыятывы. Чакаем ад вас слушных думак. Але варта разумець, што студэнцкае самакіраванне — не аднабаковы рух: маўляў, мы хочам, мы патрабуем... Гэта яшчэ і неабходнасць узяць на сабе пэўныя абавязкі. Што тычыцца Кодэкса аб адукацыі, то цяпер якраз рыхтуюцца прапановы па яго карэкцыроўцы. Мяркую, што паняцце «студэнцкае самакіраванне» ў Кодэксе таксама будзе занатавана....

**Старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА** пацікавіўся ў лідараў прафсаюзных пярвічак іх думкай наконт генеральнага і галіновага пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі і прафсаюзам: ці хапае ім у рабоце па абароне сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў студэнтаў прапісаных у гэтых дакументах палажэнняў? Адказ быў станоўчы.

**Адкрытым застаецца пытанне аб кампенсацыі за наём жылля іншагароднім навучэнцам. Сёння студэнтаў, якія скарысталіся гэтай магчымасцю, у кожнай ВНУ можна палічыць на пальцах адной рукі.**

Аляксандр Бойка лічыць, што работа ў прафарганізацыях ВНУ — выдатная школа жыцця для маладых людзей, якая дае магчымасць навучыцца ўменню кантактаваць з людзьмі, вылучаць праблемы і шукаць шляхі іх вырашэння.

— Мы заўсёды адкрыты для крэатыўных ідэй і прапаноў. Не сумнявайцеся ў нашай падтрымцы. І ўвогуле, калі казаць на маладзёжным слэнгу, то ўсё добрае раней ці пазней абавязкова «спампоўваецца», — дадаў старшыня ЦК прафсаюза.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота аўтара.**



### ДАВЕДКА:

Забяспечанасць студэнтаў установ вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі інтэрнатамі на пачатак 2014/2015 навучальнага года была на ўзроўні 70,8%, што на 3% вышэй за леташні паказчык.

Ніжэй за сярэдні паказчык забяспечанасць студэнтаў інтэрнатамі ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце (48%), Беларускім дзяржаўным універсітэце (49,4%), Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы (53,7%), Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце (54,8%), Міжнародным дзяржаўным экалагічным універсітэце імя А.Д. Сахарава (62,2%), БДУІР (63,1%), БНТУ (65,5%), Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна (68,8%).

*Элементарна*

## НАВУКА НА ПАЛЬЦАХ

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце дадзены старт новаму праекту «Навука на пальцах». Ён пройдзе ў фармаце навуковых сустрэч студэнтаў: асноўным прынцыпам зносін стане свабоднае і даступнае выкладанне зместу навуковых даследаванняў.**

Дакладчыкамі будуць выступаць студэнты БДУ, а іх слухачамі могуць стаць прадстаўнікі ўсіх вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. На сустрэчах плануецца разглядзець шырокае кола актуальных пытанняў з гуманітарных, прыродазнаўчых і дакладных дысцыплін. Тэмы дакладаў — ад ядзернай фізікі да нанатэхналогій. Галоўнай умовай прэзентацыйных матэрыялаў з'яўляецца іх даступнасць для разумення студэнтамі, якія навучаюцца на няпрофільных спецыяльнасцях. Гэта дазволіць пашырыць светапогляд усіх удзельнікаў праекта і забяспечыць іх сучаснымі ведамі з розных абласцей.

Ідэя стварэння праекта належыць Студэнцкаму савету па якасці адукацыі БДУ і абумоўлена імклівым ростам аб'ёму інфармацыйных плыняў. **Заяўкі на ўдзел у праекце прымаюцца да 1 красавіка на электронны адрас: sko_nayka@mail.ru.** Першая сустрэча запланавана на 29 красавіка, і пройдзе яна ў аўдыторыях фізічнага факультэта БДУ.

*Далучайся!*

## КОНКУРС ДЛЯ АМАТАРАЎ СЛАВЕСНАСЦІ

**Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка аб'явіў конкурс чытальнікаў «Не згасае памяці свечка», прысвечаны 70-годдзю Вялікай Перамогі.**

Конкурс чытальнікаў праводзіцца сярод вучняў 9—11 класаў агульнаадукацыйных устаноў. Асноўныя задачы конкурсу — павышэнне цікавасці моладзі да тэмы Вялікай Айчыннай вайны, развіццё літаратурнага густу і прамоўніцкага майстэрства.

Удзельнікі прачытаюць вывучаныя на памяць паэтычныя, празаічныя, а таксама драматычныя творы на беларускай або рускай мовах па сваім выбары. Магчыма і чытанне твораў уласнага сачынення. Рэгламент аднаго выступу — не больш за 5 хвілін.

Пераможцы, якія занялі першае, другое і трэцяе месцы, будуць узнагароджаны каштоўнымі прызамі. Па рашэнні журы 10 фіналістаў, што прадэманстравалі найбольш яскравыя выступы, могуць быць адзначаны заахвочвальнымі прызамі.

Усім фіналістам будуць уручаны кампакт-дыскі з запісамі лепшых конкурсных выступленняў. Настаўнікі (кіраўнікі), якія падрыхтавалі фіналістаў, будуць адзначаны падзячнымі лістамі.

Заяўкі прымаюцца па 17 красавіка па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, каб. 417а, факультэт беларускай і рускай філалогіі. Конкурс пройдзе 24 красавіка.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



26 03 2015 г.

*Сваімі рукамі*

# ПРАДАЎЦОМ У СТАЛІЦУ

## Чаканні і будні выпускніц каледжа


Фота Надзеі БУЖАН.

**Пра ўдалае размеркаванне пасля ВНУ сёння прынята клапаціцца загадзя: або вучыцца на «выдатна», каб была магчымасць выбіраць з прапанаваных варыянтаў, або самому шукаць месца для адпрацоўкі, адкуль потым дашлюць запыт ва ўніверсітэт на тваё імя. Ні для каго не сакрэт, што невялікія гарады маюць патрэбу найперш у кадрах з вышэйшай адукацыяй. А ў Мінску, наадварот, не хапае рабочых рук. Тут патрабуюцца будаўнікі, кіроўцы, швачкі. Заваёўваць сталіцу прыехалі і выпускніцы Лунінецкага політэхнічнага прафесіянальна-тэхнічнага каледжа, з якімі мне давялося паразмаўляць.**

Таццяна Дзямідчык і Ганна Гашчук былі аднагрупніцамі, вучыліся на прадаўцоў, а цяпер працуюць у адной з мінскіх прадуктовых крам.

— Не магу сказаць, што выбірала прафесію мэтанакіравана, — успамінае Таня. — Хутчэй проста не хацела заставацца ў школе, таму і пайшла вучыцца ў каледж пасля дзявятага класа.

Ганна сваё рашэнне атрымаць прафтэхадукацыю ўвогуле назвала выпадковым. Аднак падчас навучання ў каледжы дзяўчына зразумела, што веды лішнімі не будуць: спатрэбяцца і ў жыцці, і ўласна на працы.

На адпрацоўку ў Мінск дзяўчат пачалі запрашаць яшчэ на другім курсе. Прадстаўнікі розных гандлёвых сетак прыязджалі ў каледж і расказвалі пра плюсы працы ў іх, абяцалі нават прадаставіць жыллё.

На думку Таццяны, размеркаванне ў сталіцу было найлепшым варыянтам. Летам пасля выпуску яна прыехала ўладкоўвацца на працу: «У офісе аформіла дакументы, там мне далі адрас, дзе я павінна была жыць. Але на месцы мяне чакаў непрыемны сюрпрыз: высветлілася, што такіх, як я, дзяўчат з невялікіх гарадоў, на працу нанялі зашмат. Першы час мы жылі ў неверагоднай цеснаце, а праз некалькі месяцаў увогуле аказаліся літаральна на вуліцы. Некалькі дзён мы шукалі новае жыллё. Цяпер самі здымаем кватэру».

**Дзяўчатам трэба будзе рабіць выбар: заставацца на цяперашнім месцы ці шукаць іншае. Усе збіраюцца застацца ў Мінску. Кожная хоча паспрабаваць паступіць ва ўніверсітэт.**

— А калі казаць пра саму працу, то я задаволена. Па сутнасці, выбрала гэтае месца размеркавання яшчэ падчас вытворчай практыкі, — прызнаецца Ганна. — У калектыве амаль адна моладзь. Наконт заробку магу сказаць: як працуеш, столькі і зарабляеш. Ёсць у нас і перспектывы кар'ернага росту: напрыклад, я пачынала са звычайнага кантралёра-касіра, а зараз займаю пасаду старшага касіра.

Таня працуе пекарам, хоць вучыцца гэтаму ёй давялося з нуля:

— Спачатку я працавала прадаўцом, але пасля мяне перавялі ў пякарню пры краме, растлумачыўшы, што там катастрафічна не хапае супрацоўнікаў. Але да ўсяго можна прызвычаіцца і многаму навучыцца. Напрыклад, пячы смачныя піражкі.

Крыху расчаравалася ў сваім размеркаванні Яна Станкевіч, аднагрупніца дзяўчат, якая працуе ў іншай краме гэтай жа сеткі. Размеркаваць яе маглі і ў вёску, але Яна разумела, што перспектыў развіцця там будзе мала ці не будзе ўвогуле. Таму сама знайшла месца для адпрацоўкі.

— Калі ўладкоўвалася ў краму, абяцалі шмат чаго, але ў рэальнасці ўсё аказалася па-іншаму. Ёсць у маёй працы і плюсы, напрыклад, хуткі кар'ерны рост (павышэнне разраду). З мінусаў — невысокі заробак. У цэлым грошай хапае, але жыццё ў сталіцы ўсё ж не таннае. Асабліва гэта тычыцца жылля, — робіць высновы Яна.

Расклад працы ў дзяўчат даволі напружаны — два дні па 12 гадзін, а пасля два дні адпачынку. Час яны бавяць па-рознаму. «У гэтым, безумоўна, наш родны Лунінец моцна прайграе Мінску», — прызнаецца Таццяна. І тлумачыць, што ёй падабаецца хадзіць у аквапарк, на канцэрты, у кавярні.

Неўзабаве год абавязковай адпрацоўкі скончыцца, і дзяўчатам трэба будзе рабіць выбар: заставацца на цяперашнім месцы ці шукаць іншае. Усе збіраюцца застацца ў Мінску. Кожная хоча паспрабаваць паступіць ва ўніверсітэт. Дарэчы, ніводная з гераінь матэрыялу не пашкадавала аб тым, што атрымала прафесійна-тэхнічную адукацыю.

**Ганна КУРАК, студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

# ПАЎКІЛАМЕТРА ПАД ЗЯМЛЁЙ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*


...і ў штодзённым жыцці.

На працы Ілья адказвае за мацаванне горных выпрацовак. Над пройдзенай прасторай можа навісаць слой зямлі таўшчынёй пяцьсот ці болей метраў. Па словах хлопца, ціск пароды такі, што калі ў шахце здымаюць старыя драўляныя распоркі, яны ўшчэнт сплюшчаныя і цяжкія, як камяні. Яшчэ адна сфера адказнасці маладога шахцёра — бяспека. Хлопец сочыць, каб з кожнага працоўнага месца быў не толькі асноўны, але і запасны выхад. Трэцяя задача — вентыляцыя, правільны рух паветра па шахтах. Для гэтага ў памяшканнях ставяць солебетонныя перамычкі, што не даюць патокам свежага і адпрацаванага паветра змешвацца.

На ўчастку, дзе працуе Ілья, здабыча калійнай солі не вядзецца. Гэта так званы дапаможны ўчастак: тут знаходзіцца транспарт, збіраецца абсталяванне і праводзяцца іншыя работы. Але нядаўна ён адвучыўся на курсах і атрымаў новую спецыяльнасць, якая дазволіць яму працаваць здабытчыкам. Глыбіня трэцяга гарызонту, на якім звычайна знаходзіцца хлопец, — мінус 450 метраў ад паверхні мора.

— Сапраўды, зарабляем мы нядрэнна, але і здароўе сваё кладзём. Асабіста я атрымліваю каля 10 мільёнаў рублёў, а самыя высокія заробкі — у групе здабычы, якая працуе ў лаве (непасрэдна на выпрацоўках карыснага выкапню. — **Аўт.**). У нізкіх лавах, наколькі мне вядома, можна атрымліваць і да 30 мільёнаў. Але трэба зразумець, што і ўмовы працы там цяжэйшыя. Калі ў нас на выпрацоўках памер шахты — 3 на 3 метры, то ў нізкіх лавах іх вышыня можа быць роўнай 90 сантыметрам — усё залежыць ад таўшчыні пласта, які выпрацоўваецца. Вось у такой прасторы знаходзяцца людзі, машыны, абсталяванне, і ўсё гэта — у бесперапынным руху. Людзі ўвесь дзень працуюць літаральна на кукішках.

Паводле слоў Ільі, «Беларуськалій» стварае ўмовы для аздараўлення супрацоўнікаў. Так, напрыклад, санаторый-прафілакторый «Бярозка» лічыцца структурным падраздзяленнем прадпрыемства, там адпачываюць многія шахцёры Салігорска разам з сем'ямі. У разліковым лістку асобная графа — грошы на аздараўленне.

— Зразумела, што праца бывае даволі небяспечнай, — кажа Ілья. — У мяне таксама быў выпадак: з калегам паўдня залівалі трохметровую солебетонную перамычку. Пакінулі яе застываць, пасля вярнуліся. Калі здымалі апалубку, заўважылі, што цэмент сыраваты, але не надалі гэтаму значэння. Толькі адышлі — перамычка абвалілася...

Вядома, з баўленнем часу ў Ільі праблем не ўзнікае — ён працуе ў родным для сябе горадзе і мае шмат сяброў. Дарэчы, спосабаў для адпачынку тут шмат — малады горад вымагае і адпаведнай інфраструктуры. Разам са сваёй дзяўчынай хлопец здымае кватэру ў адным з раёнаў Салігорска. Галоўная цікавасць засталася з дзяцінства — гэта футбол. Цікавіцца хлопец і літаратурай. Яго любімая кніга — «Сабачае сэрца» Міхаіла Булгакава.

— Ці падабаецца мне мая праца? Шчыра скажу — так, гэта вельмі цікава. Не без мінусаў, зразумела. Часам фізічна цяжка працаваць, бо нагрузкі сур'ёзныя. Але гэта ў той жа час захапляе: калі бачыш неверагодна вялікія маштабы і становішся часткай такога буйнога працэсу. Акрамя таго, праца не манатонная, кожны дзень — нешта новае, усе заданні адрозніваюцца. Работа шахцёра — гэта яшчэ, калі хочаце, і пэўная рамантыка са «стаханаўскімі» матывамі. Вось, напрыклад, летась мы пабілі гадавы рэкорд па колькасці выдзенай руды. Таму я не сумую і ўсім задаволены. Што да будучыні, то хачу расці ў прафесійным плане, каб стаць сапраўдным спецыялістам.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*Мінск — Салігорск — Мінск.*

*Усё пад кантролем!*

# Супрацоўнікі — «у полі», а я — у лабараторыі

**Многія беларусы бачаць жывую рыбу толькі ў акварыўмах універсамаў і гіпермаркетаў. Нам стала цікава, а хто і як яе гадуе.**

Для гэтага карэспандэнты «Чырвонкі» выправіліся ў Любань, райцэнтр, у якім знаходзіцца адзін з найбуйнейшых у краіне рыбгасаў, — ААТ «Рыбакамбінат «Любань». Менавіта тут працуе сціплая лабарантка 19-гадовая Дзіяна ЮСЬКО. Яе ўнёсак у агульную справу быццам бы незаўважны, але насамрэч мае вялікае значэнне.

У госці да Дзіяны прыязджаем у даволі адказны для рыбаводаў час. Надвор'е сонечнае, і будынак рыбгаса здаецца амаль пустым.

— Многія супрацоўнікі зараз знаходзяцца "ў полі" — на сажалках каля вадасховішча, — пачынае аповед Дзіяна, — а я з-за асаблівасцяў пасады не бываю там падоўгу. Большую частку свайго працоўнага часу знаходжуся ў лабараторыі. Сутнасць маёй работы заключаецца ў кантролі хімічнага саставу вады. Шторанак мы з кіроўцам ездзім на сажалкі, дзе забіраем пробы для даследаванняў. Цягам працоўнага дня ў лабараторыі праводзяцца аналізы. Таксама я павінна сачыць за тэмпературай вады ў сажалках.


Фота Надзеі БУЖАН.

Лабараторыя сур'ёзная — даволі вялікі пакой застаўлены рознага кшталту абсталяваннем для даследаванняў: ад звычайных мікраскопаў да электронных аналізатараў кіслотнасці. Дапаўняюць карціну шматлікія бутэлькі з рэактывамі, колбы, піпеткі.

Дзіяна дэманструе нам некаторыя тэсты, якія выкарыстоўваюцца для аналізу вады: дабаўляе марганцоўку, правярае колер, параўноўвае яго з кантрольным варыянтам (дыстыляванай вадой з другой колбы). За іншыя напрамкі працы лабараторыі адказвае яе калега, 23-гадовы іхтыяпатолаг Вольга. Яна сочыць непасрэдна за станам здароўя рыбы, правярае яе на наяўнасць паразітаў, іншых хвароб. Разбірацца трэба добра, бо ў Любані гадуюць самыя розныя віды, сярод якіх карп, сом, карась, шчупак, амур, фарэль і іншыя.

— Калі я выяўлю нейкія адхіленні ў якасці вады, то павінна адразу ж паведаміць пра гэта кіраўніцтву, — расказвае Дзіяна. — Аналізуюцца такія паказчыкі, як колькасць кіслароду і вугляkіслага газу, нітратаў, жалеза, кіслотнасць асяроддзя. Калі яны не адпавядаюць нормам, можа здарыцца масавая гібель рыбы, а таму ад маёй працы ў вялікай ступені залежыць стабільнасць усяго прадпрыемства. Але, на шчасце, за паўгода працы тут у мяне ніколі не здаралася надзвычайных выпадкаў. Усе паказчыкі заўсёды ў межах нормы.

Пасля заканчэння 9 класаў школы дзяўчына вырашыла застацца ў горадзе, бо хацела быць бліжэй да бацькоў. Менавіта ў мясцовым каледжы яна і атрымала сваю цяперашнюю спецыяльнасць — лабарант хіміка-бактэрыялагічнага аналізу.

— У Любані мне шмат што падабаецца, напрыклад, прырода, адносіны людзей, — расказвае Дзіяна. — На працы я хутка з усімі пасябравала, калегі часта мне дапамагаюць. Напрыклад, у першыя дні шэфства нада мной узяла начальнік лабараторыі Наталля Аляксандраўна Навічкова. Мае веды ў сферы гідрахімічнага аналізу ў асноўным — менавіта яе заслуга. Але ёсць і мінусы жыцця ў невялікім горадзе. Тут мала месцаў для адпачынку моладзі, ды і яе самой няшмат. Можа, менавіта таму я не планую заставацца тут надоўга пасля адпрацоўкі размеркавання.

Дзіяна паведамляе нам пра свае планы. Яна ўжо паступіла ў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны... на факультэт замежных моў, вучыцца на завочным аддзяленні. Больш за ўсё яе цікавіць англійская мова, а галоўная мара дзяўчыны — стаць настаўніцай. Цікавасць да лінгвістыкі з'явілася ўжо ў каледжы — дзякуючы выкладчыку, якая там працуе.

— Фактычна ўвесь свой вольны час я займаюся, — распавядае Дзіяна, — Усё-такі вучоба ва ўніверсітэце не ідзе ні ў якое параўнанне з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Я чытаю кнігі англійскіх класікаў у арыгінале, гэта вельмі дапамагае засвоіць мову.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**
*Мінск — Любань — Мінск.*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
26 03 2015 г.

Не вучобай адзінай

# «МІСТАР», ДАВАЙЦЕ ПАСЯБРУЕМ?!

**Спевы на розных мовах, вершы, добрая музыка і незвычайныя танцы — усё гэта можна было пачуць і пабачыць на фінале конкурсу «Містар International БДУ». Як вынікае з самой назвы, удзельнікамі спаборніцтва маглі быць толькі студэнты-замежнікі. Дарэчы, такіх у вядучым універсітэце краіны нямала — каля 2,5 тысячы.**

Сам конкурс праводзіўся ўжо чацвёрты раз, праўда, пол магчымых удзельнікаў штогод чаргуецца. Напрыклад, летась мерапрыемства адбылося ў фармаце «Міс International БДУ 2014». Сёлета за званне найбольш выдатнага замежнага студэнта пазмагаліся восем маладых людзей з шасці краін свету. Хлопцы спрабавалі заваяваць увагу аўдыторыі (а свабодных месцаў у актавай зале Інстытута журналістыкі амаль не было) сваімі творчымі здольнасцямі, абаяльнасцю і пачуццём гумару.

— Для мяне конкурс стаў у першую чаргу магчымасцю знайсці новых сяброў, — расказаў перад пачаткам выступлення удзельнік з Кітая **Цянь ІЦЮНЬ, студэнт V курса філалагічнага факультэта.** — Мяне здзівіла, калі ўзяць удзел у конкурсе прапанавалі менавіта мне, але цяпер я вельмі задаволены, бо час падрыхтоўкі быў неверагодна вясёлым. Увогуле, мне вельмі даспадобы тое, як я жыву ў Беларусі. Першае, што мне прыйшлося па душы ў вашай краіне, — гэта дзяўчаты, яны ўсе падобныя да мадэляў. А яшчэ — прырода. Вы часта кажаце, што Кітай — гэта «сусветная фабрыка», але я лічу, што гэта наша бяда. Бо месцамі экалогія пакідае жадаць лепшага.

**«Паводле вынікаў нядаўна праведзенага намі сацыялагічнага даследавання, менавіта праблема адаптацыі выходзіць на першы план для студэнтаў, што прыехалі на вучобу з іншых краін».**

На развітанне Цянь адкрыў нам гісторыю свайго другога імя. Аказваецца, у Беларусі ўсе называюць яго... Юра. Справа ў тым, што ў першы год навучання адзін з выкладчыкаў прапанаваў замежным студэнтам выбраць сабе «еўрапейскія» імёны. Цяню дастаўся Юра, бо ў яго прозвішчы таксама ёсць літара «ю». Дарэчы, хлопцу яго новае імя падабаецца, хоць у першыя месяцы самым складаным у вымаўленні гукам для кітайскіх студэнтаў становіцца «р». Акрамя таго, Юра ганарыцца тым, што ён стаў цёзкам першага касманаўта.

### СПІС ПЕРАМОЖЦАЎ КОНКУРСУ «МІСТАР INTERNATIONAL БДУ»:

**Містар International БДУ — Бекзат Дастанаў (Казахстан), Інстытут журналістыкі.**
**Віцэ-містар International БДУ — Тахірджон Аліеў (Таджыкістан), эканамічны факультэт.**
**Містар глядацкіх сімпатый — Мердан Чарыеў (Туркменістан), геаграфічны факультэт.**
**Містар творчасць — Цянь Іцюнь (Кітай), філалагічны факультэт.**
**Містар мужнасць — Мухамад Шарыпаў (Таджыкістан), факультэт міжнародных адносін.**
**Містар рамантычнасць — Нізар Харфуш (Сірыя), факультэт міжнародных адносін.**
**Містар усмешка — Ішаку Ісціфанус (Нігерыя), геаграфічны факультэт.**
**Містар стыль — Янь Цзячэн (Кітай), эканамічны факультэт.**



Містар International БДУ — казах Бекзат Дастанаў.

Першы этап фіналу — выхад у дзелавым касцюме, адназначна, аказаўся паспяховым для ўсіх канкурсантаў. Але асабліва гледачоў уразіў яшчэ адзін прадстаўнік Кітая, студэнт эканамічнага факультэта Янь Цзячэн, які выйшаў на сцэну ў штанах... «леапардавай» афарбоўкі.

Нігерыец Ішаку Ісціфанус падчас другога этапу — «Візітнай карткі» — патлумачыў свой выбар на карысць геаграфічнага факультэта тым, што ў яго краіне шмат радовішчаў нафты і газу, і яму хочацца ўмець выкарыстоўваць прыродныя багацці сваёй радзімы. Бекзат Дастанаў, студэнт факультэта журналістыкі з Казахстана, прызнаўся, што ў Беларусь яго прывяло жаданне падняць узровень тамтэйшага каментатарскага майстэрства. Таджык Мухамад Шарыпаў з факультэта міжнародных адносін падзяліўся з прысутнымі сваёй марай — стаць чэмпіёнам свету па змешаных баявых адзінаборствах, а туркмен Мердан Чарыеў распавёў пра хобі — падарожжы па Беларусі аўтастопам.

Найбольшыя магчымасці праявіць сябе маладыя людзі мелі падчас апошняга, трэцяга этапу. І тут ужо кожны дапоўніў свой вобраз адрэпетаваным загадзя нумарам.

«Юра» Цянь Іцюнь для свайго творчага нумара выбраў вакал, але праспяваў адразу на дзвюх мовах: рускай і англійскай, падтрымаўшы імідж філфака. Не забыўся хлопец і пра сваю радзіму — яго вобраз дапаўнялі традыцыйны кітайскі касцюм з драконамі. Поўная адсутнасць акцэнту ў рускамоўных куплетах прымушала ўглядзецца ў твар выканаўцы — ці не падман гэта?

Праявіць сябе ў мастацтве танца вырашылі два студэнты. Ішаку Ісціфанус прадставіў з сябрамі сучасны танец з афрыканскімі матывамі, а Бекзат Дастанаў — «кактэйль» з танцаў розных стыляў.

Напэўна, найбольш пазнавальным і аўтэнтычным было выступленне Мухамада Шарыпава. Хлопец па-таджыкску выконваў песню, прысвечаную каханай дзяўчыне, і акампанаваў сабе на гітары. А ў гэты час на вялікім экране за яго спінай дэманстраваліся здымкі радзімы канкурсанта...

Мердан Чарыеў выканаў на сінтэзатары некалькі сучасных кампазіцый у розных стылях: «Cry Me A River» Джасціна Цімберлейка і «Sex Bomb» Тома Джонса. Яшчэ адзін музычны нумар прадэманстраваў Нізар Харфуш. Сяброўка сірыйца спявала кампазіцыю французскай спявачкі Ізабэль Жэфруа, больш вядомай пад псеўданімам ZAZ, а сам хлопец акампанаваў ёй на гітары.

Арыгінальнасцю выступлення адзначыўся другі канкурсант з Таджыкістана — Тахірджон Аліеў. Хлопец выбраў для творчага нумара чытанне вершаў. Ён вельмі чула і пранікнёна выканаў вядомае «Прызнанне» Аляксандра Пушкіна, сарваўшы авацыі залы.

Пасля завяршэння апошняга нумара стала зразумела, што журы чакае нялёгкая задача — выбраць найлепшага з кандыдатаў. Магчыма, не апошнюю ролю сыграла месца правядзення мерапрыемства — галоўны прыз турніру атрымаў студэнт журфака Бекзат Дастанаў (дзякуючы ў тым ліку і шалёнай падтрымцы публікі). Аднак і астатнія канкурсанты не засталіся без прызоў — кожнаму з іх дасталіся ўзнагароды ў іншых намінацыях.

**Хлопцы спрабавалі заваяваць увагу аўдыторыі (а свабодных месцаў у актавай зале Інстытута журналістыкі амаль не было) сваімі творчымі здольнасцямі, абаяльнасцю і пачуццём гумару.**

— Мы вельмі хваляваліся, калі праводзілі першы такі конкурс чатыры гады таму, — прызнаўся **Вадзім РЭЗНІКАЎ, начальнік упраўлення міжнародных сувязяў БДУ,** — бо не было зразумела, ці захочуць замежныя студэнты ўвогуле ўдзельнічаць у спаборніцтве, ці атрымаецца ў іх годна выступіць. Але наша няўпэўненасць у мінулым — канкурсанты год ад года мацнеюць, нумары становяцца больш цікавымі. Галоўнае, што «Містар International БДУ» выконвае сваю асноўную задачу — аб'ядноўвае беларускіх і замежных студэнтаў у адну супольнасць. Паводле вынікаў нядаўна праведзенага намі сацыялагічнага даследавання, менавіта праблема адаптацыі выходзіць на першы план для студэнтаў, што прыехалі на вучобу з іншых краін.



Цянь Іцюнь праспяваў на дзвюх мовах і стаў «Містарам творчасць».

Па словах Вадзіма Рэзнікава, у апошнія пяць гадоў БДУ няўхільна нарошчваў колькасць студэнтаў з-за мяжы, але цяпер універсітэт выйшаў на аптымальную лічбу. Яна складае каля 10% ад усёй колькасці тых, хто навучаецца ў ВНУ. Для заходнееўрапейскіх устаноў такі паказчык лічыцца добрым.

Дарэчы, ужо 2 красавіка ўсіх аматараў жаночага розуму і прыгажосці чакаюць на конкурсе «Міс БДУ 2015», які пройдзе ў адным са сталічных клубаў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**



Пераможца конкурсу Бекзат Дастанаў выбраў мастацтва танца *(на фота справа)*.



У першым конкурсе кітаец Янь Цзячэн эпатаваў публіку сваімі штанамі.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Перспектывы

# Еўрапейская адукацыя — без «адрыву» ад айчыннай

**Прэзентацыя міжнароднага праекта па дыстанцыйным навучанні Cyber Edycation Network (CEN) прайшла ў Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі. Праект прадставіла дэлегацыя з Цэнтральна-Еўрапейскага ўніверсітэта (г.Скаліцэ, Славакія) на чале з яго дырэктарам Хайдзі Шварцовай.**



У аснову праекта пакладзена інтэрактыўная сістэма відэаканферэнцсувязі. Прадстаўнікоў вядучых беларускіх ВНУ, якія прысутнічалі на прэзентацыі, звязалі з дапамогай сеткі з ВНУ Англіі, Італіі, Францыі, Расіі, Украіны і, вядома ж, Славакіі, прадэманстраваўшы на практыцы магчымасці Cyber Edycation Network. Аднак гэта толькі тэхнічны бок справы. Аб'яднаўшы вышэйшыя навучальныя ўстановы з розных краін свету, CEN дае студэнтам магчымасць навучацца ў самых лепшых выкладчыкаў еўрапейскіх універсітэтаў, не пакідаючы сваёй краіны.

— Cyber Edycation Network — гэта магчымасць скончыць паралельна два ўніверсітэты і атрымаць еўрапейскі дыплом. Пасля аб'яднання праграм ужо не трэба будзе здаваць адны і тыя ж дысцыпліны. Неабходна будзе толькі здаць дзяржаўныя іспыты ў абодвух універсітэтах, — расказала аб перспектывах праекта **спадарыня Хайдзі ШВАРЦОВА.**

Студэнтам будуць прапанаваны варыянты вывучэння як адной асобнай дысцыпліны, так і прафесійная падрыхтоўка з атрыманнем дыплома бакалаўра або магістра. Спыніўшы свой выбар на пэўнай спецыяльнасці, напрыклад, «інфармацыйныя тэхналогіі», студэнт БДУІР пасля здачы ўсіх іспытаў зможа атрымаць на рукі адразу два дыпломы — БДУІР і выбранага ім еўрапейскага ўніверсітэта. Выгада відавочная: гэта сэканомлены час і адсутнасць выдаткаў на пражыванне за мяжой.

Асабліваасцю сеткі Cyber Edycation Network з'яўляецца магчымасць адначасовага online-падключэння да лекцый ці семінараў цэлага шэрагу ўніверсітэтаў з самых розных краін свету. Акрамя гэтага, прапусціць важны матэрыял будзе немагчыма, паколькі студэнт заўсёды зможа атрымаць доступ да сховішча запісаў. Лекцыі, а таксама дадатковы матэрыял, можна будзе праглядзець на любой прыладзе: камп'ютары, планшэце або смартфоне.

— Семінар-прэзентацыя праходзіў у БДУІР невыпадкова, паколькі наш універсітэт валодае сучасным абсталяваннем для арганізацыі дыстанцыйнага навучання і неабходным вопытам работы ў гэтай сферы, развіваючы дыстанцыйныя праграмы навучання ў філіялах БДУІР у Чыкага і Бостане, — патлумачыў **рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА.** — Еўрапейскі ўніверсітэт валодае шырокай базай ведаў у галіне эканомікі, менеджменту і бізнес-аналітыкі, але, па сутнасці, БДУІР і іншым універсітэтам Беларусі прапануецца супрацоўніцтва з цэлым холдынгам універсітэтаў.

Далучэнне БДУІР да адукацыйнага працэсу Cyber Edycation Network — лагічны і натуральны крок у развіцці дыстанцыйнага навучання. Паміж БДУІР і ўніверсітэтамі, якія ўдзельнічаюць у Cyber Edycation Network, плануецца распрацоўка сумесных адукацыйных праграм па тэхнічным профілі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*У пошуках сябе*

# «ЦЯЖКІЯ» — ТЫЯ, КАМУ ЦЯЖКА?

**Наш карэспандэнт наведала прыёмнік-размеркавальнік для непаўналетніх і даведалася, хто і за якія правіны трапляе ў закрытую ўстанову.**

## «ВЫП'Ю — І АДРАЗУ ПРЫГОДЫ ШУКАЮ!»

Сталічны завулак Акрэсціна. Сюды прывозяць дзяцей з усіх куткоў краіны. Валацугі, уцекачы, дзяўчаткі-летуценніцы, «транзітнікі». Іх затрымліваюць на вакзалах, у пад'ездах дамоў, на вуліцах. Аднак большасць, працэнтаў 80, трапляюць сюды па рашэнні суда: ашуканцы, дваровыя хуліганы, малалетнія зладзеі. Цяпер на ўтрыманні ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх УУС Мінаблвыканкама знаходзіцца 14 чалавек. Тут яны правядуць не больш за 30 сутак. Далей — родны дом або спецшколы і спецвучылішчы (як вырашыць суд). Пакуль жа ёсць час паразважаць над тым, за што апынуліся тут і як не трапіць сюды яшчэ раз. І ў кожнага свае адказы, думкі, гісторыі.

Дзіма і Вадзім — браты. Аднаму 16, другому 17, але яны ўжо паспелі, што называецца, дарослага жыцця паспытаць. У прыёмнік-размеркавальнік трапілі другі раз, але верыць, што гэты «візіт» дакладна апошні.

— Гэта ўсё піва. Вып'ю — і адразу прыгоды шукаю! Машыну разбіць, магнітолу і калонкі скрасці, веласіпед суседскі ўзяць паганяць, у чужую кватэру залезці. Так, цяпер я разумею, што гэта дрэнна, але калі ты п'яны, табе нічога не страшна... — хлюпаючы носам, прызнаецца ўчарашні «герой» Дзіма.

— Брат тут праз мяне, — уступае ў размову Вадзім. — Ён наогул адзін любіць быць, усё марыць пра нешта! Гэта я заўжды яго з сабой на вуліцу цягну, вось і дацягаўся, — перабіраючы збітыя да крыві пальцы, працягвае хлопец.

Сам Вадзім не толькі піва і чужыя веласіпеды любіць, але і рукамі не супраць памахаць. Другі раз у прыёмнік-размеркавальнік за збіццё чалавека трапіў. Незнаёмец зрабіў заўвагу падлеткам наконт таго, што петарды пад нагамі ў мінакоў узрываюць. Вынік — тры пераламаныя рабры.

